✓**27 – 28 красавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі** прайшлі **XIX Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні.** Традыцыйна іх праблемнае поле ўключала пытанні гісторыі кніжнай культуры ад старажытнасці да сучасных тэндэнцый развіцця. За два дні на пленарным і рабочых пасяджэннях выступілі больш за 60 навукоўцаў. Канферэнцыя праходзіла ў змешаным фармаце, былі арганізаваны анлайн-трансляцыя і дыстанцыйнае падключэнне аддаленых удзельнікаў.

Канферэнцыя дазволіла абмеркаваць шырокае кола пытанняў, сярод якіх эвалюцыя кніжнай культуры ад старажытных рукапісаў да выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій, сучасны стан і перспектывы развіцця комплекснай навукі пра кнігу.

Штогадовыя Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні спрыяюць наладжванню навуковага дыялогу і супрацоўніцтва паміж даследчыкамі розных краін, выпрацоўцы аптымальна эфектыўных падыходаў для вырашэння праблем, даюць магчымасць падзяліцца вынікамі навуковых дасягненняў, а галоўнае – натхняюць удзельнікаў на ўвасабленне новых ідэй і праектаў.